17. Шамов, В. П. Павел Шпилевский и его книга «Путешествие по Полесью и белорусскому краю» // Краеведение Беларуси / В. П. Шамов. – Минск : РИПО, 2014. – С. 161–168.

18. Шимкевич, Ф. Корнесловъ русскаго языка, сравненнаго со всеми главнейшими славянскими наречиями и съ двадцатью четырьмя иностранными языками. Часть первая / Ф. Шимкевич. – СПб. : Типография Императорской Академии Наук, 1842. – 160 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа :http://speakrus.ru/mix/shimkevitch/korneslov1.pdf. – Дата доступа : 14.03.2019.

19. Шимкевич, Ф. Корнесловъ русскаго языка, сравненнаго со всеми главнейшими славянскими наречиями и съ двадцатью четырьмя иностранными языками. Часть вторая / Ф. Шимкевич. – СПб. : Типография Императорской Академии Наук 1842. – 167 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа :http://speakrus.ru/mix/shimkevitch/korneslov2.pdf. – Дата доступа : 13.03.2019.

***Г. М. Давыдава***

*старшы выкладчыккафедры даўніверсітэцкай падрыхтоўкі*

*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

# ЭФЕКТЫЎНЫЯ МЕТАДЫ НАВУЧАННЯБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ

Цэнтралізаванае тэсціраванне (ЦТ) як форма ўступных іспытаў для правядзення конкурсу пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі ўведзена ў Рэспубліцы Беларусь з 2005 г. Сертыфікат ЦТ па адной з дзвюх дзяржаўных моў – беларускай ці рускай – у ліку трох абавязковых пры паступленні на большасць спецыяльнасцей. Менавіта таму падрыхтоўка да ЦТ па гэтых вучэбных прадметах з’яўляецца актуальнай задачай як для саміх абітурыентаў, так і для адпаведных устаноў адукацыі, для якіх надзвычай важным становіцца падбор найбольш эфектыўных методык выкладання і метадаў навучання.

Неабходнасць уважлівага стаўлення да выбару методык выкладання і метадаў навучання прадмета прадыктавана яшчэ і тым фактам, што мінімальны прахадны бал ЦТ па беларускай / рускай мове падчас мінулагадовай уступнай кампаніі быў дастаткова нізкім. Так, для ўсіх спецыяльнасцей, акрамя філалагічных, прахадныя балы складалі ад 10 да

100 балаў, для філалагічных спецыяльнасцей – ад 25 да 100 балаў. Аднак пры гэтым у 2018 г. не пераадолелі парогавага значэння тэставага бала (10 балаў) 1337 абітурыентаў (5,61 % ад агульнай колькасці ўдзельнікаў тэсціравання (23 829 чалавек); у 2017 г. – 2 046 абітурыентаў, або 7,52 %), тры абітурыенты не справіліся ні з адным заданнем [4, с. 10]. Таму якасная падрыхтоўка да ЦТ па беларускай мове застаецца важнай і актуальнай задачай, вырашэнне якой ў многім залежыць ад удала падабраных методык выкладання і метадаў навучання.

Больш як дваццацігадовая практыка выкладання беларускай мовы на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта дае магчымасць аўтару артыкула зрабіць пэўныя назіранні, абагульненні і высновы адносна найбольш эфектыўных метадаў навучання беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ. Як правіла, слухачы прыходзяць на факультэт з даволі нізкім узроўнем ведаў па прадмеце. У працэсе навучання на факультэце веды па беларускай мове істотна паглыбляюцца і сістэматызуюцца, слухачы набываюць трывалыя моўныя і маўленчыя кампетэнцыі – «веды аб сістэме мовы, моўных адзінках як кампанентах гэтай сістэмы, правілах іх спалучэння ў моўнай плыні і функцыяніравання ў выказваннях, фарміраванне ўмення карыстацца набытымі ведамі і вопытам» [3, с. 43]. Вынікі працы слухачоў курсаў абумоўлены многімі суб'ектыўнымі і аб'ектыўнымі фактарамі, сярод якіх немалая роля належыць эфектыўнасці выкарыстаных выкладчыкам метадаў навучання прадмету.

Метады навучання беларускай мове – спосабы ўзаемадзеяння таго, хто вучыць, і таго, хто вучыцца, накіраваныя на дасягненне канкрэтнай лінгвадыдактычнай мэты – неаднаразова выступалі ў якасці аб'екта даследавання навукоўцаў-педагогаў. Сучасная тэорыя і практыка навучання роднай мове грунтуецца на працах і педагагічным вопыце Л. П. Падгайскага, В. У. Протчанкі, У. К. Андрэенкі, М. С. Яўневіча, В. П. Краснея, Я. М. Лаўрэля, М. Г. Яленскага, С. А. Язерскай і многіх іншых. Іх папярэднікамі ў фарміраванні і развіцці метадычнай думкі на Беларусі былі К. Міцкевіч, В. Тэпін, а таксама Б. Тарашкевіч, П. Пачобка, А. Смоліч, Я. Лёсік, І. Самковіч, І. Пратасевіч, Н. Шэўчык, В. Самцэвіч, А. Багдановіч і інш. [5, с. 15–40].

Сукупнасць метадаў навучання беларускай мове ўтварае ў сучаснасці складаную і разгалінаваную сістэму, якая можа задаволіць усе патрэбы педагога-выкладчыка на розных этапах адукацыйнага працэсу. Паралельна або папераменна з традыцыйна-класічнымі метадамі эфектыўна

выкарыстоўваюцца такія папулярныя ў сучаснай адукацыйнай прасторы асобасна арыентаваныя метады, як эўрыстычныя, крэатыўныя, кагнітыўныя, прадуктыўныя і інш.

Як вядома, крытэрыямі для стварэння той ці іншай класіфікацыі і сістэматызацыі метадаў навучання могуць выступаць розныя падставы. Так, паводле крыніцы перадачы і ўспрымання вучэбнай інфармацыі метады навучання падзяляюцца на **славесныя** (лекцыя, паведамленне, гутарка і інш.), **практычныя** (практыкаванні аналітычнага або сінтэтычнага характару, лінгвістычны эксперымент і інш.), **наглядныя** (назіранні, ілюстрацыі і інш.). Логіка падачы інфармацыі выступае падставай для падзелу метадаў навучання на **дэдуктыўныя** і **індуктыўныя**. У залежнасці ад характару вучэбнай дзейнасці вылучаюць метады **рэпрадуктыўныя** і **праблемна-пошукавыя**. Паводлеэтапаў вучэбнага працэсуметады падзяляюцца на метады **матывацыі і стымулявання**, метады **засваення** новага матэрыялу, метады **замацавання** вывучанага матэрыялу. Асобнае месца сярод метадаў навучання займаюць **метады кантролю** за вучэбнай дзейнасцю: вусны кантроль (франтальнае апытванне, індывідуальнае апытванне), пісьмовы кантроль (кантрольная работа, дыктант, пераказ, сачыненне), кантроль з выкарыстаннем электронных прылад і інш. Можна прывесці прыклады і іншых класіфікацый метадаў навучання, у аснову якіх будуць пакладзены іншыя падставы [2, с. 81–91].

У сучаснасці лінгвадыдактыка і практыка выкладання найбольш пашыранымі і прызнанымі метадамі навучання лічаць такія метады, як паведамленне (слова) настаўніка, гутарка, практыкаванне, самастойная праца, назіранне і моўны аналіз, лінгвістычны эксперымент, граматычнае мадэляванне [2, с. 81–82; 5, с. 46–155]. Сказанае актуальна найперш для ўстаноў сярэдняй адукацыі – школ, гімназій і ліцэяў. Вопыт працы на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі сведчыць, што навучанне беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ змяшчае прыярытэты і ў радзе выпадкаў патрабуе падбору іншых метадаў, паколькі задачы пры вывучэнні беларускай мовы ва ўстановах сярэдняй адукацыі і на факультэце істотна адрозніваюцца.

Да ліку найбольш эфектыўных метадаў навучання беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ можна назваць **моўны аналіз**, які «прадугледжвае арганізацыю аналітычнай дзейнасці ў працэсе фанетычнага, словаўтваральнага, марфемнага, марфалагічнага, сінтаксічнага, стылістычнага разбораў» [5, с. 153]. Функцыі моўнага аналізу дэталёва

ахарактарызаваў вядомы метадыст беларускай мовы М. Г. Яленскі, які сказаў, што ён «дапамагае вучням свядома і трывала засвоіць тэарэтычныя звесткі па мове; служыць сродкам замацавання, паўтарэння, сістэматызацыі і праверкі ведаў па мове; фарміруе ўменне назіраць, аналізаваць і дыферэнцыраваць моўныя з’явы, устанаўліваць у іх агульнае і прыватнае; з’яўляецца сродкам развіцця абстрактнага мыслення, выпрацоўкі навыкаў лагічнага доказу» [5, с. 154]. Гэтыя значэнні цалкам адпавядаюць галоўнай мэце навучання беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ, а таму і сам метад моўнага аналізу шырока выкарыстоўваецца для рэалізацыі гэтай мэты.

Моўны аналіз суадносіцца з вывучаемым раздзелам і падзяляецца на:

- фанетычны аналіз: фанема, гук, літара, націск;
- марфемны аналіз;
- словаўтваральны аналіз;
- аналіз лексікі;
- марфалагічны аналіз часціны мовы;
- сінтаксічны аналіз (у межах сказа);
- аналіз тэксту.

У працэсе навучання беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ розныя віды моўнага аналізу мэтазгодна праводзіць з выкарыстаннем разнастайных матэрыялаў, у тым ліку – матэрыялаў мінулагадовых ЦТ, што актыўна практыкуецца намі на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі.

Моўны аналіз як найбольш пашыраны метад навучання беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ суадносіцца з іншым не менш важным і актуальным метадам – **самастойным аналізам матэрыялу**. Найбольшы эфект дасягаецца толькі пры рэалізацыі іх у спалучэнні, што дазваляе слухачам трывала засвоіць неабходны вучэбны матэрыял. Самастойны аналіз матэрыялу, у сваю чаргу, у многім абапіраецца на такі метад навучання, як **самастойная работа з падручнікам і іншымі крыніцамі** (табліцамі, схемамі, канспектамі і да т. п.). Канечне, якасная падрыхтоўка да ЦТ па вучэбным прадмеце нават пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў і пры наяўнасці неабходных вучэбных матэрыялаў не можа быць здейснена без належнай самастойнай працы слухачоў.

Правядзенне розных відаў моўнага аналізу, у тым ліку і самастойнага аналізу матэрыялу, а таксама самастойнай работы з вучэбнымі крыніцамі, прадугледжвае і выкарыстанне такіх метадаў навучання, як **пастаноўка пытанняў**, **знаходжанне вывучаемай моўнай з’явы**, **дыферэнцыяцыя**,

**класіфікацыяісістэматызацыямоўнага матэрыялу**, **падбор адпаведных прыкладаў, канспектаванне і практыкаванне**.

Асаблівая ўвага пры падрыхтоўцы да ЦТ па беларускай мове надаецца **метадам кантролю за вучэбнай дзейнасцю**, таму што яны, па-першае, паказваюць узровень ведаў па той ці іншай тэме або раздзеле; па-другое, выяўляюць пропускі і хібы ў іх засваенні; па-трэцяе, з’яўляюцца сродкам матывацыі вучэбнай дзейнасці. Пры выкладанні курса беларускай мовы на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі выкарыстоўваюцца розныя віды як вуснага (франтальнае і індывідуальнае апытванне), так і пісьмовага (кантрольная работа, дыктоўка) кантролю [1]. У параўнанні з аналагічным вучэбным працэсам ва ўстановах сярэдняй адукацыі такія віды кантролю, як пераказ ці сачыненне, пры падрыхтоўцы да ЦТ па беларускай мове аказваюцца малаэфектыўнымі і таму, напрыклад, у нашай выкладчыцкай практыцы не выкарыстоўваюцца. З іншага боку, вельмі добра сябе зарэкамендавалі такія віды кантролю за вучэбнай дзейнасцю, як слоўнікавыя дыктоўкі і розныя віды кантрольных работ (тэматычная, абагульняльная, выніковая кантрольная работа). Трэба адзначыць, што па змесце кантрольныя работы адпавядаюць праграме па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для ўстаноў сярэдняй адукацыі і праграме для абітурыентаў, а па форме максімальна набліжаны да тэстаў ЦТ. Гэта дапамагае правесці кантроль засваення слухачамі вучэбнага матэрыялу і, акрамя гэтага, рыхтуе іх да выканання тэставых заданняў на ЦТ.

Эфектыўнасць некаторых з вышэй названых метадаў навучання павялічваецца пры выкарыстанні сучасных высокатэхналагічных сродкаў. Напрыклад, на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі пры навучанні беларускай мове запатрабаванай аказваецца інтэрактыўная дошка.

Такім чынам, да ліку найбольш эфектыўных метадаў навучання беларускай мове пры падрыхтоўцы да ЦТ можна аднесці розныя віды моўнага аналізу, самастойны аналіз матэрыялу, самастойную работу з крыніцамі, пастаноўку пытанняў, знаходжанне вывучаемай моўнай з’явы, дыферэнцыяцыю, класіфікацыю і сістэматызацыю моўнага матэрыялу, падбор адпаведных прыкладаў, канспектаванне, а таксама розныя віды кантролю за вучэбнай дзейнасцю. Умелае спалучэнне і выкарыстанне гэтых метадаў на розных этапах вучэбнага працэсу здольна ўдасканаліць ужо сфарміраваную ў слухачоў моўную і маўленчую кампетэнцыю і забяспечыць якаснае засваенне вучэбнага матэрыялу і якасную падрыхтоўку да ЦТ.

**Літаратура**


1. Давыдава, Г. М. Беларуская мова : электронны вучэбна-метадычны комплекс для слухачоў факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ / Г. М. Давыдава ; БДУ, Фак. даўніверсітэцкай адукацыі, Каф. даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. – Мінск : БДУ, 2018. – 159 с. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу :http://elib.bsu.by/handle/123456789/206222. – Дата доступу : 16.06.2019.
2. Методыка выкладання беларускай мовы / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.
3. Протчанка, В. У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. – Мінск : НІА, 2001. – 212 с.
4. Уважліва стаўцеся да роднага слова // Настаўніцкая газета. – 15 лістапада 2018 г. – С. 10–12 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу :http://rikc.by/ru/publications/28.11.2018.pdf . – Дата доступу : 03.06.2019.
5. Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка / М. Г. Яленскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224 с.



***К. В. Жартун***

*магістрант кафедры беларускага мовазнаўства*

*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*


## ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ З САМАТЫЧНЫМ КАМПАНЕНТАМ І ІХ ПЕРАКЛАД НА РУСКУЮ МОВУ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАМАНА У. КАРАТКЕВІЧА «ЧОРНЫ ЗАМАК АЛЬШАНСКІ»)

У рамках сучаснай лінгвістычнай навукі ўсё больш актуальным становіцца вывучэнне фразеалагічнага складу мовы з арыентацыяй на асобныя фразеакампаненты рознай тэматыкі, паколькі фразеалагізмы, якія ўтрымліваюць пэўныя лёгка вычляняльныя тэматычныя адзінкі, маюць найбольш выразныя нацыянальна-культурныя канатацыі.

Першачарговым аб’ектам аналізу пры гэтым становяцца фразеалагізмы з саматычным складнікам, адметнай асаблівасцю якіх лічыцца іх здольнасць перадаць праяўленне духоўнага і матэрыяльнага жыцця з дапамогай слоў, што абазначаюць фізічныя і матэрыяльныя